УДК 7.01:7.038

# Інтэрпрэтацыі катэгорыі “традыцыя” ў тэорыі і практыцы мастацтва мадэрнізму і постмадэрнізму

**Цыбульскі М.Л.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*“Традыцыя” належыць да ліку найбольш універсальных паняццяў, якія ахопліваюць усе сферы чалавечага жыцця і культуры. Кожны гістарычны перыяд вылучае сваю канцэпцыю традыцыі. Напачатку і напрыканцы XX стагоддзя адносіны да “традыцыі” як да катэгорыі, якая з’яўляецца важным элементам эстэтычнай свядомасці, былі супрацьлеглыя, ды і сама “традыцыя” ў гэты час падверглася трансфармацыі.*
*Мэта дадзенага артыкула заключаецца ў выяўленні эстэтычнай своеасаблівасці і ролі катэгорыі “традыцыя” ў мастацкіх працэсах, аналізе канцэпцый традыцыі ў тэорыі і практыцы мадэрнізму і постмадэрнізму, у вызначэнні своеасаблівасцей рашэння праблемы суадносін традыцыі і інавацыі ў мастацкай культуры XX стагоддзя.*
***Матэрыял і метады.*** *Метадалогія дадзенага даследавання вызначаецца найбольш прадуктыўным у дадзеным выпадку міждысцыплінарным сістэмным падыходам да вывучаемай праблемы. У працы выкарыстаны гістарыяграфічны і тэарэтыка-метадалагічны аналіз прац навукоўцаў, якія звярталіся да праблем традыцыі і наватарства ў філасофіі, мастацтвазнаўстве, эстэтыцы.*
***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Амбівалентнае стаўленне да традыцыі ўключае разуменне яе ўніверсальнага гістарычнага значэння і адчуванне яе негатыўнай ролі як сілы, якая ў той ці іншай ступені стрымлівае індывідуальную ініцыятыву і крытычнае мысленне.*
*У XX стагоддзі звернуты ў будучыню мадэрнізм абвясціў адыход ад векавых традыцый класікі і нават распачаў сапраўдную барацьбу з традыцыяй. Прыхільнасць да традыцыі ў кантэксце мадэрнізму расцэньвалася як прыкмета адсталасці.*
*Характэрнай рысай мастацтва постмадэрнізму стала імкненне аб’яднаць стылі розных эпох, прызнаць каштоўнасць шматвяковых і шматнацыянальных традыцый у культурнай спадчыне розных краін і народаў. Дамінантнымі адзнакамі новых падыходаў да традыцыі становяцца прынцыпы множнасці і дэіерархічнасці. А само паняцце традыцыі фактычна замяшчаецца паняццем інтэртэкстуальнасці.*
***Заключэнне.*** *Праведзенае даследаванне дазволіла выявіць своеасаблівасць трактоўкі катэгорыі “традыцыя” ў мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай эстэтычных парадыгмах. Пры гэтым розныя погляды на традыцыю ў ракурсе мадэрнізму і постмадэрнізму не адмяняюць універсальнасці, уласцівай ёй на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва.*
***Ключавыя словы:*** *традыцыя, мадэрнізм, постмадэрнізм, тэорыя і філасофія мастацтва.*

*(Ученые записки. – 2014. – Том 18. – С. 114–121)*

# Interpretations of the Category of Tradition in the Theory and Practice of the Art of Modernism and Postmodernism

**Tsybulski M.L.**
***Educational establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk***

*The concept of tradition belons to most universal ones, which embrace all spheres of human life and culture. Every historical period has its own concept of tradition. In the early and late XX century attitude to tradition as a category, which is an important element of aesthetic consciousness, was contradictory and the tradition itself was transformed.*
*The purpose of the article is finding out aesthetic peculiarity and role of the category of tradition. While the concept of tradition itself is actually substituted by the concept of intertextuality.*
***Conclusion.*** *The research made it possible to find out peculiarity of the interpretation of the category of tradition in modernist and postmodernist aesthetic paradigms. At the same time, different ideas of tradition from the point of view of modernism and postmodernism don’t reject universality whch is typical to it during the whole history of mankind.*
***Key words:*** *tradition, modernism, postmodernism, theory and philosophy of art.*

*(Scientific notes. – 2014. – Vol. 18. – P. 114–121)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* mtsybulsky@rambler.ru – **М.Л. Цыбульскі**

Традыцыя як катэгорыя, якая з'яўляецца важным элементам розных узроўняў эстэтычнай свядомасці, у XX стагоддзі падверглася трансфармацыі, складаным перабудовам і нават поўнаму адмаўленню. Адмова ад векавых традыцый класікі стала адной з асноўных асаблівасцей мастацтва мадэрнізму. Сучасная культурна-мастацкая сітуацыя перад эстэтычнай навукай і мастацтвам паставіла шмат пытанняў, сярод якіх трансфармацыя класічных эстэтычных катэгорый і фарміраванне новага катэгарыяльнага апарату некласічнай эстэтычнай навукі. Спробы вызначыць сутнасць катэгорыі "традыцыя" ў тэорыі і практыцы некласічнай эстэтычнай свядомасці ўяўляюць сабою актуальную даследчую задачу. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем выявіць спецыфічныя якасці катэгорыі "традыцыя", характар і сэнс зменаў, што адбываюцца з ёй, а значыць – вызначыць логіку і скіраванасць развіцця сучаснай культуры і мастацтва.

Мэта дадзенага артыкула заключаецца ў выяўленні эстэтычнай своеасаблівасці і ролі катэгорыі "традыцыя" ў мастацкіх працэсах, аналізе канцэпцый традыцыі ў тэорыі і практыцы мадэрнізму і постмадэрнізму, у вызначэнні своеасаблівасцей рашэння праблемы суадносін традыцыі і інавацыі ў мастацкай культуры XX стагоддзя.

Значныя крокі па выяўленні структуры і спосабаў функцыянавання розных традыцый, класіфікацыі традыцый былі зроблены ў мастацтвазнаўчых публікацыях апошніх дзесяцігоддзяў. Пытанні традыцый і наватарства, розныя аспекты ролі традыцый у мастацтве разглядаюцца ў працах Г.-Гадамера, Р. Генона, І. Гердэра, Ю. Давыдава, Р. Джангужіна, А. Зісь, Д. Зільбермана, А. Каменскага, І.Т. Касавіна, Т. Кафарава, Е. Катаева, У. Конана, І. Кулікова, А. Мальдзіса, М. Няклюдавай, Л. Немчанка, В. Плахава, Н. Сонцава, І. Суханава, Ф. Турсун-Задэ, В. Уласавай, С. Франка, Я. Шацкага, Т. Эліот і інш. Навуковая літаратура, прысвечаная розным аспектам вывучэння катэгорыі традыцыі, у цэлым сведчыць пра значнасць гэтай праблемы і ўстойлівую цікавасць да яе навукоўцаў. Па-ранейшаму змест традыцый, узаемадачыненні традыцый і інавацыі застаюцца актуальнай праблемай і становяцца падставай і тэмай для разважанняў і вострай палемікі.

**Матэрыял і метады.** Метадалогія дадзенага даследавання вызначаецца найбольш прадуктыўным у дадзеным выпадку міждысцыплінарным сістэмным падыходам да вывучаемай праблемы. У працы выкарыстаны гістарыяграфічны і тэарэтыка-метадалагічны аналіз прац навукоўцаў, якія звярталіся да праблем традыцыі і наватарства ў філасофіі, мастацтвазнаўстве, эстэтыцы.

Філасофскі статут тэрміна "традыцыя" складаецца з комплексу каштоўнасных уяўленняў, нормаў паводзінаў, звычак і навыкаў практычнай і грамадскай дзейнасці, формаў свядомасці і інстытутаў чалавечых зносін, якія характарызуюць сувязь сучаснасці з мінулым, перадаюцца з пакалення ў пакаленне і выступаюць адным з рэгулятараў грамадскіх адносін. Па сутнасці, традыцыя ўяўляе сабой групавы досвед, выяўлены ў сацыяльна-арганізаваных стэрэатыпах, своеасаблівую актуалізацыю мінулага і мабілізацыю яго ў інтарэсах сучаснасці. Прыкметна, што дадзенае вызначэнне дазваляе выключыць з традыцыі індывідуальны досвед як не калектыўную з'яву.

Старажытнасць традыцыі – адна з важных умоў яе трываласці і ўкаранёнасці ў соцыуме. "Чым больш традыцыя праіснавала, чым менш яна змянялася, тым вышэй яе статут, тым мацней яна стаіць перад усімі магчымымі спробамі крытыкаваць яе з пазіцый сучаснасці. Іншымі словамі, час існавання стварае для традыцыі адмысловую сакральную абарону" [1].

У шырокім сэнсе слова з'яў па-за традыцыямі проста не існуе. Нішто не нараджаецца на пустым месцы, без засваення мінулага вопыту. Традыцыі акумулююць тыя арганічныя рысы розных бакоў жыццядзейнасці, якія адбіраюцца, захоўваюцца і развіваюцца пакаленнямі як лепшыя, тыповыя, звыклыя. Пры гэтым трэба разумець, што традыцыі не ўяўляюць сабой нешта раз і назаўжды дадзенае, застылае, нерухомае, не з'яўляюцца сінонімам мінулага. Традыцыям таксама ўласціва трансфармацыя. Сутнасць традыцыі лепш за ўсё выяўляецца не ў застылым вызначэнні, а падчас яе існавання ў рэальнай і "жывой" прасторы соцыума. Як вядома, традыцыя па сваёй сутнасці кансерватыўная. Калі побач з традыцыяй узнікае яе супрацьлегласць – контртрадыцыя, то практычна заўжды адна з традыцый будзе імкнуцца здушыць іншую, усталяваць сваё непадзельнае дамінаванне ў соцыуме, каб у далейшым звесці яе да поўнага забыцця.

Як форму і механізм захавання і развіцця гістарычнага і сацыякультурнага досведу традыцыю можна разглядаць у шматлікіх аспек-

тах – камунікатыўным, трансляцыйным, аксіялагічным, гнасеалагічным, эмацыйным, дзейсным і інш. Але ў любым з іх паняцце традыцыі мае на ўвазе пераемнасць.

Адрозніваюць тры асноўныя тыпы традыцый: этнічныя (народныя), нацыянальныя і сацыяльныя традыцыі. Любы тып традыцыі – гэта, у першую чаргу, досвед, які назапашваецца ў выглядзе сістэмы стэрэатыпаў і выяўляецца, рэалізуецца ў формах звычаяў, рытуалаў, абрадаў, цырымоній, святаў і інш.

Вядомы даследчык мастацтва XX стагоддзя А. Каменскі вылучае “традыцыю” як “сілу мастацкай дынамікі”, як “канон” і адной з асноватворных вызначае “этнатрадыцыю” [2, с. 202–244]. Зразумела, што этнічныя традыцыі звязаны з рознымі відамі народнай творчасці – фальклорам, а таксама мастацкімі рамёствамі. Аднак не ўсякія народныя традыцыі належаць да мастацкіх, як і не ўсе мастацкія традыцыі з’яўляюцца народнымі. Да народных, у першую чаргу, належаць этнасацыяльна значныя традыцыі.

Відавочна, “традыцыя традыцый” – гэта пісьменнасць, з дапамогай якой адбываецца атрыбуцыя, расшыфроўка і асэнсаванне элементаў спадчыны. Хоць па-ранейшаму асноўнай, самай выразнай, складанай і характэрнай формай рэалізацыі традыцый застаецца свята ў шырокім сэнсе гэтага слова. Сваё месца традыцыі маюць і ў выяўленчым мастацтве.

У агульнафіласофскім кантэксце нацыянальныя традыцыі – гэта сістэма нацыянальных стандартаў, якія замацоўваюць у свядомасці чалавека ідэі гонару, велічы і годнасці яго нацыі, гераічнай нацыянальнай гісторыі, высакароднасці яго народа ва ўсіх мінулых і сучасных дзеях, яго выбітных (па сусветнай значнасці) літаратуры, мастацтве, навуцы і інш.

Сацыяльная традыцыя – гэта не абмежаваная ніякімі рамкамі нацыянальных традыцый “мульцікультурнасць”, якая прадугледжвае ў мастацкім творчым працэсе выкарыстанне розных формаў, моў, стыляў і інш.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Амбівалентнае стаўленне да традыцыі ўключае разуменне яе ўніверсальнага гістарычнага значэння і адчуванне яе негатыўнай ролі як сілы, якая ў той ці іншай ступені стрымлівае індывідуальную ініцыятыву і крытычнае мысленне, склалася ў еўрапейскай культуры ўжо ў пачатку XIX стагоддзя. Каштоўнасць традыцыі ў гегелеўскай філасофіі магла б параўнацца з роляй “тэзы”, наяўнасць якой неабходна для працэсу станаўлення таксама, як і яго адмаўлення. Карлам Марксам традыцыя тлумачыцца як выражэнне класавых і групавых інтарэсаў, як складнік ідэалогіі, як прылада маніпулявання масавай свядомасцю. Для Фрыдрыха Ніцшэ традыцыя ёсць квінтэсэнцыя абывацельскай коснасці, якая замінае станаўленню звышчалавека і падлягае адмаўленню.

У той жа час тэрмін “традыцыя” становіцца цэнтральным у інтэгральным традыцыяналізме. Канцэпцыі інтэгральнага традыцыяналізму асэнсоўваюць традыцыю як утоеныя сакральныя веды, якія, тым не менш, беззваротна згублены для заходняга грамадства [3, с. 6]. Аднак традыцыя, па меркаванні Р. Генона і Ю. Эволы, не знікла бясследна, яна стала таемнымі сакральнымі ведамі, якія перадаюцца ў выніку ініцыяцыі. Прадстаўнікі інтэгральнага традыцыяналізму лічаць, што “ў традыцыі няма нічога агульнага ні з мясцовым каларытам, ні з народнымі звычаямі, ні з мудрагелістымі дзеяннямі мясцовых жыхароў (...). Гэта паняцце злучана з вытокамі: традыцыя – гэта перадача комплексу ўкаранёных спосабаў палягчэння нашага разумення сутнасных прынцыпаў універсальнага (сусветнага) парадку, бо без староннняй дапамогі чалавеку не дадзена зразумець сэнс свайго існавання” (...). Ідэя, найболей эквівалентная і найболей здольная адлюстраваць сэнс слова “традыцыя”, – гэта духоўныя адносіны паміж майстрам і вучнем. Значыць, гэта ствральнае ўздзеянне, аналагічнае духоўнаму пакліканню ці натхненню, настолькі ж рэальнае для духу, як спадчыннасць для цела [4, с. 3–4].

Супярэчлівасць прыроды традыцыі спараджае крайнасці ў яе ўспрыманні і адзнацы. З аднаго боку, традыцыя выглядае як апалогія і кансервацыя мінулага, знак нязменнасці, а парой – сінонім адставання і нават адсталасці. З іншага боку, традыцыя выступае як неабходная ўмова захавання, пераемнасці і ўстойлівасці чалавечага быцця, перадумовай і пачаткам фарміравання ідэнтычнасці чалавека, групы ці цэлага соцыума.

Сапраўды, традыцыя ў розных тыпах грамадства і розныя перыяды гісторыі выступае адным з найважнейшых каштоўнасных прыярытэтаў чалавецтва. І калі ва ўмовах традыцыйнага тыпу грамадства традыцыя аказваецца фактарам, што спрыяе яго ўстойлівасці, то ў інавацыйным грамадстве традыцыя выступае ключавым фактарам, пераадоленне якога становіцца падставай для

руху да новай якасці. “Экзістэнцыяльная сутнасць каштоўнасці традыцыі заключана ў тым, што яна дазваляе станоўча вырашыць ключавыя сэнсава-жыццёвыя пытанні. Сярод іх пытанне пра сэнс асобнага жыцця (...). Акрамя таго – найважнейшае пытанне асабістай неўміручасці, рашэнне якога становіцца магчымым праз пераадоленне забыцця, праз увекавечанне каштоўнасцей аднаго пакалення ў памяці іншага дзякуючы пераемнасці традыцыі. У гомеастатычным, традыцыйным і інавацыйным грамадстве роля традыцыі мае свае характэрныя рысы, але ў кожным з выпадкаў яна з’яўляецца крыніцай адзінства, цэласнасці грамадства” [5].

Нават агульны аналіз філасофскіх канцэпцый “традыцыі” дае магчымасць убачыць варыятыўнасць значэнняў гэтага паняцця. “Адпаведна, традыцыя аказваецца канструяванай мадэллю, набываючы спецыфічную канфігурацыю ў залежнасці ад спецыфікі філасофскага дыскурсу” [6]. Напэўна, сімвалічна і тое, што, спрабуючы зразумець традыцыю, мы звяртаемся да філасофіі, але ў ходзе аналізу нечакана для сябе выяўляем, што “сама філасофія, “высвечаная традыцыяй”, пачынае адкрывацца нам у нябачанай да таго шматграннасці адценняў і сэнсаў” [1]. Актуальнасць і відавочнасць абазначанай вышэй праблемы нават паспрыяла стварэнню асаблівай дысцыпліны – “філасофіі традыцыі” [7].

**Традыцыі і інавацыі ў мастацтве.** Шматпланавае паняцце традыцыя належыць да ліку складаных феноменаў і пранізвае розныя сферы чалавечай жыццядзейнасці. У некаторых галінах ведаў яно мае шырокае “поле сэнсаў”. Няма традыцый наогул, а ёсць традыцыі пэўнай сферы чалавечай дзейнасці. У кожнай сферы традыцыі валодаюць сваёй спецыфікай. Гэта адносіцца і да мастацтва.

У еўрапейскім мастацтве пачынаючы з Новага часу разуменне традыцыі ў цэлым грунтуецца на гістарычным падыходзе, што дазваляе ўбачыць і ацаніць ролю і значэнне традыцыі ў такім кантэксце. У эпоху Асветы фарміруецца крытычнае стаўленне да традыцыі як да феномену, абмежаванага часавымі рамкамі. Але ўжо кансерватыўны Рамантызм будзе сцвярджаць зусім процілеглае стаўленне да традыцыі, вызначаючы яе галоўнай рухаючай сілай гісторыі. Для эпохі мадэрну слова “традыцыя” пачне асацыіравацца, у першую чаргу, з тым, што злучана з мінулым, страціла навізну і таму супрацьстаіць развіццю і абнаўленню. Стаўленне да традыцыі падчас далейшага развіцця мадэрну будзе станавіцца ўсё больш і больш негатыўным, саступаючы прыярытэты арыентацыі на навацыю.

У сучаснай тэорыі мастацтва дагэтуль няма агульнапрызнанага вызначэння тэрміна “традыцыя”. Розныя даследчыкі ўкладаюць у паняцце “традыцыя” розны змест. Адны пад традыцыяй у мастацтве разумеюць галоўным чынам устойлівасць захавання і пераемнасць выяў, формаў і прыёмаў. Іншыя разглядаюць традыцыю як працэс адбору, засваення, перадачы і развіцця існуючага гістарычна мастацкага досведу; ці як механізм узнаўлення мастацкага метаду, ці як пэўны тып суадносін паміж паслядоўнымі стадыямі развіцця аб’екта, калі “старое” пераходзіць у “новае” і прадуктыўна “працуе” ў ім, ці як спосаб захавання асаблівасцей тэматыкі і стылю.

Сапраўды, фарміраванню традыцыі спрыяюць мастацкія каштоўнасці мінулага, якія маюць агульнанацыянальную ці агульначалавечую значнасць. Традыцыя ў мастацтве – не проста механічная сума фармальных прыкмет, а дыялектычная з’ява, злучаная як з мінулым, так і з сучаснасцю і будучыняй. Звычайна традыцыя ўспрымаецца як своеасаблівая памяць мастацкай культуры, як спалучэнне актуальнага і сучаснага. Пры гэтым традыцыя ўключае не толькі ўжо вядомыя архетыпы творчага мыслення, але і адносна новыя прынцыпы мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Элементы традыцыі носяць характар устойлівага канону, а сама традыцыя захоўвае для сучаснасці значэнне мастацкага ўзору і забяспечвае бесперапыннасць паступальнага развіцця мастацтва. “Традыцыі ў мастацтве ўключаюць мастацка-эстэтычныя прынцыпы адлюстравання рэчаіснасці, якія склаліся гістарычна (традыцыі крытычнага рэалізму, сацыялістычнага рэалізму); цэласныя фармальна-змястоўныя структуры, што нясуць у сабе найбольш каштоўныя мастацкія дасягненні чалавецтва (жанравыя, родавыя, відавыя асаблівасці мастацтва); выяўленча-выразныя сродкі, уласцівыя спецыфічным формам мастацтва пэўнага народа (вобразныя рашэнні); элементы, уласцівыя мастацкім школам і кірункам (тэхніка выкарыстання матэрыялу, пабудова кампазіцыі, стылявыя асаблівасці)” [8, с. 52–54].

Традыцыям у мастацтве ўласцівы шырокі спектр іх інтэрпрэтацыі. Шляхі фарміравання і развіцця традыцый у розных галінах мастацтва розныя. На іх фарміраванне ўплываюць

шматлікія фактары: адны ўскосна, іншыя непасрэдна ўздзейнічаюць на характар вобраза і структуру мастацкай выявы. Вельмі часта традыцыі не выяўляюцца ў вонкавым падабенстве ці ў прамых запазычаннях і ўтоены ва ўнутраным змесце твора. У выяўленчым мастацтве традыцыя набывае мноства праяў, ад прымітыўнай імітацыі, стылізацыі пад традыцыю, да ўсведамлення традыцыі як свету высокіх архетыпаў.

Колькі б мы ні казалі пра традыцыі і іх асаблівасці, не варта забываць, што крыніцай традыцый, іх носьбітамі з’яўляюцца людзі. Авалоданне традыцыямі азначае не толькі азнаямленне з імі, але іператварэнне мастацкага досведу ў неабходны момант уласнага развіцця. У гэтым працэсе ўзрастаюць магчымасці мастацкага засваення свету, адбываецца крышталізацыя новых традыцый. Але нягледзячы на тое, што традыцыя перадаецца звонку, яна не з’яўляецца прадуктам уласнага творчага ўяўлення індывіда і яму не належыць.

Як вядома, традыцыя і традыцыйнасць агульнапрызнаныя як спецыфічныя асаблівасці народнага мастацтва. У народным мастацтве гэтыя традыцыі калектыўнай творчасці складаліся стагоддзямі і шліфаваліся шматлікімі пакаленнямі людзей [9]. Даследчыца народага мастацтва М. Някрасава справядліва мяркуе, што традыцыя – гэта глыбока змястоўная і ўнутраная з’ява, аснова якой – правільнае стаўленне да нацыянальнай спадчыны. Але спадчына – гэта ўсё мастацтва мінулага, а ў традыцыю ж пераходзіць тое, што мае асаблівую каштоўнасць, што здольна па-новаму жыць у сучаснасці.

Традыцыя і наватарства – гэта суадносныя паняцці, супрацьлегласць і ўзаемазалежнасць якіх выяўляе рэальную дыялектыку ўсякага паўнавартаснага акта мастацкай творчасці. Па сутнасці, недзе ў полі ўзаемадзеяння традыцый і наватарства ляжыць мастацтва кожнай эпохі. Традыцыя забяспечвае пераемнасць у мастацтве, дае навацыі кропку адліку для таго, каб было ад чаго адштурхвацца, з чым уступаць у плённы дыялог. Паміж традыцыяй і навацыяй існуюць сінхронна-дыяхронныя сувязі. Усякая традыцыя калісьці была навацыяй, а ўсякая навацыя ў выпадку паспяховага ўкаранення асуджана стаць традыцыяй. Нават такі вядомы рэфарматар жывапісу, як французскі мастак Анры Маціс, сцвярджаў, што, адмовіўшыся ад традыцыі, мастак можа дасягнуць толькі кароткачасовага поспеху і неўзабаве імя яго будзе забыта.

Многія даследчыкі перакананыя ў тым, што супрацьпастаўленне мастакоў па ступені перавагі традыцыі ці навацыі з’яўляецца сумніўным і павярхоўным. У XX стагоддзі склаўся новы тып суадносін традыцыі і навацыі, велізарная перавага якога ў немагчымай раней ступені свабоды, якая часам балансуе на мяжы страты сфарміраванай на працягу стагоддзяў раўнавагі паміж імі.

Наватарства ў мастацтве – гэта не заўжды ўсё новае. Звычайна наватарства – гэта істотная змена, якая спрыяе паглыбленню і развіццю мастацкай канцэпцыі, пашырэнню сэнсаў, узбагачэнню сродкаў выразнасці. Інавацыя – не толькі вынаходніцтва ці выпрацоўка новых ідэй, выяў, мадэляў ці прынцыпаў дзеяння, але і арганічная рэкампазіцыя элементаў існуючых традыцый, укараненне таго, што бярэцца з кантэксту іншых культур.

Традыцыя і наватарства па-рознаму праяўляюць сябе ў розных стылях. Кожны стыль прадугледжвае тую ці іншую наватарскую форму і тую ці іншую ступень пераемнасці, розныя тыпы і ўзроўні мастацкіх узаемадзеянняў, розную дыялектыку традыцыі і наватарства.

У значнай ступені наватарства ў мастацтве абумоўлена сацыяльна-гістарычнымі прычынамі. Але адпаведная роля належыць і ўнутраным законам мастацкага развіцця, паколькі абнаўленне і змена зместу неаддзельныя ад наватарства ў галіне мастацкай формы. У мастацтве наватарства выяўляецца ў развіцці жанравай, відавой, стылявой варыятыўнасці, у адкрыцці і адлюстраванні новых бакоў і граняў жыцця і духоўнага свету чалавека.

**Адносіны да традыцыі ў мастацтве XX стагоддзя.** У XX стагоддзі асноўны вектар развіцця філасофска-эстэтычнай думкі і мастацкай творчасці вызначылі пошукі “новых вымярэнняў”, імкненне да татальнай навізны і адмова ад прынцыпаў класічнага мастацтва. Адбывалася трансфармацыя класічных эстэтычных катэгорый, фарміраванне новага катэгарыяльнага апарату некласічнай эстэтычнай навукі. Катэгорыя традыцыі ў мастацтве XX стагоддзя падверглася трансфармацыі і атрымала новую трактоўку, выяўляючы сябе ў прасторы ўзаемадзеяння розных узроўняў некласічнай эстэтычнай свядомасці і мастацкай практыкі.

Звернуты ў будучыню мадэрнізм абвясціў адыход ад векавых традыцый класікі і нават

распачаў сапраўдную барацьбу з традыцыяй. Прыхільнасць да традыцыі тут расцэньвалася як прыкмета адсталасці. Аднак у самім адмаўленні ад традыцыі была закладзена глыбокая традыцыйнасць, уласцівая ўсяму Новаму часу, бо ідэя прагрэсу, пагоня за новым адпавядала ў еўрапейскай культуры традыцыйнаму разуменню развіцця ўсіх сфер грамадскага жыцця. Асобныя філосафы лічаць, што традыцыйнасць як характарыстыка соцыума цалкам вычэрпвае сябе ў эпоху мадэрну, паколькі логіка індустрыяльнага развіцця патрабуе замены традыцыі як сацыяльнага арыенціра на агульначалавечую рацыянальнасць [10, с. 80–95].

У мастацтве першай паловы XX стагоддзя амаль усе кірункі і рухі, што ўзніклі, крытычна адносіліся да традыцыі, але, тым не менш, выявілі імкненне стварэць і ўвекавечваць уласныя традыцыі. Парываючы з мінулым, мадэрнізм на самой справе “таемна прагнуў” ператварэння ў традыцыю.

Адносіны да традыцыі ў мастацтве апошняй трэці XX стагоддзя эвалюцыянавалі ад поўнага яе адмаўлення, супрацьпастаўлення традыцый і навацый да іх “мірнага суіснавання”, да своеасаблівага дыялогу стыляў і эпох”. Постмадэрнізм звяртаецца да класічных традыцый, сфарміраваных папярэднімі эпохамі, і гэтыя традыцыі становяцца жывой крыніцай натхнення разам з новымі ідэямі. Па сутнасці, постмадэрнізм робіць акцэнт на актуалізацыі мастацкіх традыцый. Мастацкая дзейнасць постмадэрнізму прадуктыўна ўцягвае ў свой спектр досвед архаічнай, еўрапейскай і ўсходняй традыцый, традыцый класічнага мастацтва і авангардысцкіх эксперыментаў.

Выкарыстанне ў мастацтве небывала шырокага спектра традыцый як “па гарызанталі” (зварот да традыцый розных краін), так і “па вертыкалі” (уключэнне ў сучасную мастацкую практыку розных гістарычных пластоў культуры) спрыяе таму, што спецыфіку катэгорыі “традыцыі” ў эстэтычнай тэорыі і практыцы постмадэрнізму вызначае шматузроўневасць і шматмернасць эстэтычнага досведу.

Нягледзячы на тое, што постмадэрнізм пераадольвае супярэчнасці мадэрнізму, бо ён “звернуты да дыялогу, няхай і трактаванаму часта іранічна, аднак постмадэрнізм адмаўляецца ад глыбіннага спасціжэння сэнсаў, якія нясе традыцыя, і часцей дэканструіруе традыцыю ці гуляе з ёй.

Характэрнай прыкметай мастацтва постмадэрнізму стала імкненне аб’яднаць стылі розных эпох, прызнаць каштоўнасць шматвяковых і шматнацыянальных традыцый у культурнай спадчыне розных краін і народаў. Дамінантнымі адзнакамі новых падыходаў да традыцыі становяцца прынцыпы множнасці і дэіерархічнасці. З гэтага вынікае раўнапраўе ўсіх традыцый, ніводная з якіх не можа прэтэндаваць на манаполію. Адначасовая прысутнасць розных традыцый прадугледжвае іх плюралістычнасць і эклектычнасць. А само паняцце традыцыі фактычна замяшчаецца паняццем інтэртэкстуальнасці. У адным творы мастакі спалучаюць розначасовыя “высокія” і “нізкія” традыцыі, але больш увагі надаюць знешняму (фармальнаму, а не сэнсаваму!) боку традыцый; імкнуцца да іх іранічнага пераасэнсавання.

Апазіцыя “новае–старое” губляе сваю актуальнасць, а катэгорыі традыцыі і наватарства выяўляюць небывалую раней гнуткасць і адноснасць. Постмадэрнізм вырывае традыцыю з улацівага ёй кантэксту і змяшчае яе ў новы кантэкст, ператвараючы ў навацыю. І тое, што раней разглядалася як навацыя, пачынае ўспрымацца як узноўленая традыцыя. Асабліва вольна і часам радыкальна постмадэрнізм падвяргае дэканструкцыі крайнія формы мадэрнісцкага мастацтва.

Разам з усім гэтым на ўзаемадачыненні традыцый і навацый у постмадэрнісцкай паэтыцы, безумоўна, аказалі ўплыў размыванне межаў і крытэрыяў мастацтва, яго дэгуманізацыя, адмаўленне яго галоўных эстэтычных прынцыпаў – міметызму, прыгажосці, сімвалізму, арыентацыі на духоўную рэальнасць і ўзнёслае і інш.

Важная рыса постмадэрнісцкай канцэпцыі традыцыі злучана з новым адчуваннем і разуменнем часу і прасторы. Традыцыя губляе сваю гістарычнасць і лінейнасць, а мастацтва становіцца полем для інтэртэкстуальных дыялогаў з самымі рознымі традыцыямі. Нелінейны вобраз часу, своеасаблівы палёт творчай думкі скрозь Прастору і Час, яскрава характарызуюць спробы мастакоў па-новаму паглядзець на свет.

Дыяпазон звароту да традыцый у мастацтве постмадэрнізму распасціраецца “ад простага капіравання, тыражыравання традыцыйных прыёмаў у кансерватыўным мастацтве, выкарыстання традыцыі ў якасці вонкавай формы, камерцыйнай дэкарацыі, якая апраўдвае чаканні ўспрымаючага суб’екта, якая абапіраецца на правераныя, “адпрацаваныя” клішэ, да іх (традыцый) поўнага, таталь-

нага разбурэння, што пагражае знішчэннем самога мастацтва, дэканструкцыі і ўзнаўленні традыцый у новай культурнай прасторы ў модусе гульні ці пародыі, у форме настальгічных ці эстэцкіх стылізацый, інтэлектуальных галаваломак, “гульні ў пацеркі” [11, с. 301–305].

Разам з тым у другой палове XX стагоддзя адмысловую ролю ў праблеме традыцый адыгрывае феномен нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. “Пачынаючы з 1970-х гадоў у мастацтве многіх краін асноўнай з’явай, якая кансалідавала творчы досвед таго ці іншага этнасу, выступае этнічная традыцыя, у якую ўключаюцца ўсе традыцыйныя элементы культуры вызначанага перыяду” [12, с. 148–151]. Арыентацыя на этнічныя традыцыі, этнічнае стала своеасаблівай праявай творчай індывідуальнасці беларускіх мастакоў. Мастакі звяртаюцца да этнічных традыцый розных нацыянальных культур, да пошуку асаблівасцей нацыянальнага характару і светаадчування, да стылістыкі народнага мастацтва; да традыцыйных матываў і знакаў этнічных культур; да старажытных міфаў і прымітыву. Прыкметна, што ў рэчаіснасці этнакультурныя традыцыі арганічна ўжываюцца з тэхналагічнымі навацыямі.

Мастакі 70–80-х гадоў адчуваюць, што мова мастацтва патрабуе абнаўлення з дапамогай звароту да традыцый. Усё часцей у працах мастакоў сустракаюцца цытаты з твораў старых майстроў. Маніпуляванне цытатамі з чужых твораў – характэрны момант постмадэрнісцкай паэтыкі, прыкметы якой можна заўважыць не толькі ў выяўленчым мастацтве.

Таксама ў гэты час у СССР працягвала існаваць уражанне, што ёсць добрыя і дрэнныя традыцыі, і ілюзія, што імі можна кіраваць. У савецкім мастацтве была распаўсюджана пазіцыя, паводле якой традыцыя інтэрпрэтуецца як нейкая канструкцыя, якую можна выкарыстоўваць, калі ў ёй ёсць неабходнасць, і наадварот – прыбраць, калі яна замінае. Многія памятаюць “савецкія традыцыі”, якія “фарміраваліся” літаральна на вачах і выдатна ўпісваліся ў створаныя ідэалогіяй канструкцыі.

Некаторым здаецца, што праблемы традыцый у сучасным мастацтве не самыя істотныя. Але гэта толькі на першы погляд. І сёння ў нашым пост-постмадэрністычным мастацтве, па-ранейшаму прысутнічаюць і з’яўляюцца папулярнымі не толькі традыцыі папярэдніх эпох, але і традыцыі, што фарміруюцца нанава. Відавочна, што побач з лепшымі традыцыямі авангарда, мадэрнізму, постмадэрнізму паралельна існуюць і кансерватыўныя, камерцыйныя і іншыя кірункі і практыкі. Але для свядомасці абывацеля слова “традыцыя”, на жаль, па-ранейшаму, у першую чаргу, асацыіруецца з мінулым, страціўшым навізну, і ў сувязі з гэтым мала патрэбным для далейшага развіцця.

**Заключэнне.** Праведзенае даследаванне дазволіла выявіць своеасаблівасць трактоўкі катэгорыі “традыцыя” ў мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай эстэтычных парадыгмах. Пры гэтым розныя погляды на традыцыю ў ракурсе мадэрнізму і постмадэрнізму не адмяняюць універсальнасці, уласцівай ёй на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Развіццё мастацтва ў XX стагоддзі сведчыць і пра тое, што стаўленне да традыцыі як да эстэтычнага носьбіту духоўнага зместу як да ідэі не мае нічога агульнага ні з эпігонскім капіраваннем традыцыйных прыёмаў, ні з прымітыўным запазычваннем формы, колеру і інш.

Сёння ў мастацтве з’явіліся новыя каштоўнасці, новыя жыццёвыя практыкі. Але паняцце “традыцыя” па-ранейшаму прывабнае і для сучаснага мастацтва. Ва ўмовах глабалізацыі і інфарматызацыі традыцыя працягвае быць звяном, якое злучае з гістарычнай памяццю і дапамагае захаваць нацыянальна-культурную ідэнтычнасць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ивахненко, Е.Н. Традиция и философия / Е.Н. Ивахненко // http://sf.ff-rggu.ru/prepod/ivahnenko_e_n/tradiciya_i_filosofiya/#sthash.4Bz8MFyM.dpuf.
2. Каменский, А.А. О смысле художественной традиции / А.А. Каменский // Советское искусствознание, 82. – 1983. – Вып. 1. – С. 202–244.
3. Генон, Р. Кризис современного мира / Р. Генон. – М.: Эксмо, 2008. – С. 6.
4. Ален де Бенуа. Определение традиции / Ален де Бенуа // Полюс: альманах – 2008. – № 1. – С. 3–4.
5. Баева, Л.В. Традиция как основа духовного бытия / Л.В. Баева // Ценности изменяющегося мира: экзистенциальная аксиология истории: монография. – Астрахань: Изд-во АГУ, 2004.
6. Кардинская, С. Конструирование «традиции» в структурах философского дискурса / С. Кардинская // http://against-postmodern.org/kardinskaya-s-konstruirovanie-traditsii-v-strukturakh-filosofskogo-diskursa.
7. Быстров, В.Ю. Человек в мире традиций / В.Ю. Быстров. – В. Новгород: НовГУ, 2001.

8. Данилова, А.В. Традиция как основа современной культуры / А.В. Данилова // Художественно-эстетическое образование и проблемы современной культуры: материалы III Междунар. науч.-практ. конф. / ВГПУ. – Владимир, 2005. – С. 52–54.
9. Богуславская, И.Я. Проблемы традиций в искусстве современных народных художественных промыслов / И.Я. Богуславская // Творческие проблемы современных народных художественных промыслов: сб. ст. – Ленинград: Издательство «Художник РСФСР», 1981.
10. Арендт, Х. Традиции и современная эпоха / Х. Арендт // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 7, Философия. – 1992. – № 1. – С. 80–95.
11. Данилова, А.В. Концепция традиции в контексте эстетики постмодернизма / А.В. Данилова // Вестн. Костром. гос. ун-та им. Н.А. Некрасова. – 2008. – № 4. – С. 301–305.
12. Нехвядович, Л.И. Этническая художественная традиция как категория теоретической истории искусства / Л.И. Нехвядович // Изв. Алтайск. гос. ун-та. – 2010. – № 2-2(66). – С. 148–151.



*Паступіў у рэдакцыю 08.12.2014 г.*

*Прыняты ў друк 29.12.2014 г.*